## ВОДЗЫЎ

пра дысертацыю
«ЭСТЭТЫЧНЫ ІДЭАЛ ЛІТАРАТУРЫ БЕЛАРУСІ
ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТАГОДДЗЯ»
на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура
КОСЦІНАЙ Жанны Вячаславаўны

Катэгорыя эстэтычнага ідэалу носіць міждысцыплінарны характар і на ўзроўні літаратуразнаўчых даследаванняў праяўляецца праз выяўленне ў творы спецыфікі гістарычна-тыпалагічнага і індывідуальна-аўтарскага.

Ідэалы мастака непасрэдным чынам адлюстроўваюць гістарычны кантэкст, глыбінныя працэсы грамадства, дынаміку часу, з'яўляючыся адным з асноўных чыннікаў пазнання быцця.

**Актуальнасць** дысертацыі Ж.В. Косцінай выўляецца якраз у наспелай патрэбе даць сучасныя характарыстыкі і ацэнкі літаратурнага працэсу Беларусі першай паловы XIX ст., у якім, паводле меркавання крытыкі 2000-х гг., знітаваныя вытокі нацыянальнай ідэі і нацыянальнай літаратуры; разглядзе эстэтыкі і паэтыкі літаратурных твораў адзначанага перыяду. Неабходна даць падагульняючы погляд на плён літаратараў першай паловы XIX ст. уключна з тымі творамі, што напісаны як слыннымі беларускімі творцамі, так і беларуска-польскімі пісьменнікамі.

**Навуковая навізна, значнасць і абгрунтаванасць вынікаў** дысертацыйнай працы Ж.В. Косцінай звязаныя з вельмі прадуктыўным і прафесійным выкарыстаннем культурна-гістарычнай метадалогіі, а таксама прыёмаў цэласнага і кампаратыўнага аналізу мастацкіх тэкстаў. Вылучаны і прааналізаваны вельмі вялікі аб'ём тэкставага матэрыялу на гісторыка-культурным фоне, што дазволіла інавацыйна раскрыць эвалюцыю эстэтычнага ідэалу даследаванага перыяду.

Ж.В. Косціна правяла пераканаўчую публічную апрабацыю сваіх матэрыялаў (агульная колькасць канферэнцый з яе ўдзелам – 22). Таксама грунтоўна апрабіраваны асноўныя палажэнні і вынікі даследавання ў навуковым друку: апублікавана 28 прац, у тым ліку 8 артыкулаў у навуковых крыніцах, рэкамендаваных ВАК Беларусі (3,56 аўт. арк.); 4 публікацыі ў навуковых зборніках (1,31 аўт. арк.); 16 публікацый матэрыялаў навуковых канферэнцый (4,11 аўт. арк.). Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 8,98 аўтарскіх аркушаў.

Заўвагі і ўдакладненні асобных момантаў дысертацыі наступныя:

1. Грунтоўны аналіз і вывучэнне эстэтычнага ідэалу такіх літаратурных напрамкаў першай паловы XIX ст., як сентыменталізм і рамантызм, вядзе да неабходнасці больш дэталёвага звароту і да эстэтычнай традыцыі класіцызму ды рэалізму ў творах пісьменнікаў адзначанага перыяду.
2. Кажучы пра эстэтычнае мадэляванне літаратурнага зместу ў вытокавы перыяд, нельга не адзначыць ацалелую лірычную споведзь, песню-плач

«Зайграй, зайграй, хлопча малы…» Юльяна Ляскоўскага (літаратурная містыфікацыя – Паўлюк Багрым).

3. У аналізаваных бурлескна-травесційных творах В. Равінскага «Энеіда навыварат» і К. Вераніцына «Тарас на Парнасе» выклікае пытанне адсутнасць прозвішчаў аўтараў-стваральнікаў.

Выказаныя заўвагі, аднак, не датычацца асноўнага зместу працы, палажэнняў, якія вынесены на абарону, заключных высноў; яны не зніжаюць агульнай высокай ацэнкі даследавання, праведзенага Ж.В. Косцінай.

Дысертацыя Ж.В. Косцінай, выкарыстаныя ёю прыёмы аналізу фактычнага матэрыялу, а таксама назіранні і вывады, што паслядоўна і лагічна выкладаюцца падчас даследавання катэгорыі эстэтычнага ідэалу ў літаратуры Беларусі першай паловы XIX ст., даюць падставы заключыць, што Ж.В. Косціна адпавядае навуковай кваліфікацыі, на якую прэтэндуе, і заслугоўвае прысуджэння ёй вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

Кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры сусветнай літаратуры і
замежных моў установы адукацыі
«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Еўфрасінні Полацкай» Т.Р. Багарадава

Подпись Багарадавой Т.Р. удостоверяю
Специалист по кадрам

Аддзел кадраў

Паступіў у савет па абароне дысертацый 10.01.2025г.
вучоны сакратар (А.І. Богдан)

З водгукам азнаёмлена 22.01.2025 Косціна Ж.В.